*І. І. Бамбешка*
(Мінск)

# Фарміраванне прыватных калекцый на тэрыторыі Гродзеншчыны (канец XVIII – пачатак XX ст.)

У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Гродзеншчыны, пачало распаўсюджвацца асветніцтва. У музейнай справе гэта праявілася ў стварэнні музеяў пры асобных навучальных установах. Ініцыятарам і арганізатарам першага падобнага музея пры гродзенскай медыцынскай школе быў упраўляючы каралеўскімі эканоміямі ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) А. Тызенгаўз (1733–1785). Беларускі даследчык Г. А. Каханоўскі называе яго калекцыянерам, хоць дакладных звестак аб яго калекцыянерскай дзейнасці пакуль не выяўлена [6, с. 82]. Разам з тым прымаючы пад увагу, што, плануючы адкрыць медыцынскую школу, ён набыў прыродазнаўчы збор бібліятэкара Радзівілаў К. Магніцкага, а таксама тое, што калекцыяніраванне розных прадметаў было традыцыйным заняткам у асяродку арыстакратыі, тым больш у эпоху Асветы, можна думаць, што Г. А. Каханоўскі не памыляецца [2, с. 53].

Важную ролю ў распаўсюджванні ідэй асветы адыграў збор Храптовічаў, які істотна адрозніваўся ад замкавых магнацкіх збораў. З’яўляючыся своеасаблівымі асяродкамі культуры і навукі, гэтыя калекцыі кніг і дакументаў, а таксама прадметаў мастацтва прыцягвалі ўвагу адукаванай часткі грамадства.

І. Храптовіч (1729–1812) атрымаў грунтоўную адукацыю, што дазволіла яму ў будучым займаць высокія пасады ў ВКЛ (дыпламатычнага пасланніка ў Парыжы і Вене, маршала галоўнага трыбунала, канцлера). Ён быў вялікім рэфарматарам і ўнёс значны ўклад у развіццё асветы ў ВКЛ, апошнім канцлерам якога ён быў. Акрамя таго, І. Храптовіч быў заўзятым бібліяфілам. Менавіта ён заснаваў прыватную бібліятэку, вядомую як «Бібліятэка Храптовічаў», якая стала значнай культурнай з'явай на тэрыторыі Беларусі. Яна фарміравалася на працягу другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. І. Храптовіч пачаў збіраць сваю бібліятэку ў Варшаве, потым перавёз яе ў свой радавы маёнтак Шчорсы (цяпер – Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці), дзе яна размяшчалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў спецыяльна абсталяваным памяшканні новага палаца, пабудаваным архітэктарам Дж. Сако ў 1770–1776 гг. Увесь верхні паверх новага палаца быў прыстасаваны пад бібліятэку. Кнігі займалі тры галерэі, якія ўтваралі амфітэатр, па якім можна было без цяжкасцей перамяшчацца. У цэнтры памяшкання знаходзіліся стол і пюпітры [2, с. 53].

Крыніцы папаўнення кніжнага збору былі самыя розныя. Адной з найбольш значных крыніц набыцця заходнееўрапейскіх старадрукаў была багацейшая бібліятэка кардынала І. Імперыялі ў Рыме. Пасля смерці кардынала ў 1737 г. бібліятэка апошняга паводле завяшчання стала ўласнасцю дзяржавы, а пазней паступіла ў продаж. Гэтым скарыстаўся І. Храптовіч, які набыў рэдкія кнігі, відаць, у 1793–1794 гг., у час свайго знаходжання ў Італіі [12, с. 7; 16, с. 19].

Наступнай крыніцай набытку старадрукаў быў збор вядомага ў XVIII ст. польскага рэлігійнага дзеяча, заснавальніка Варшаўскай публічнай бібліятэкі епіскапа І. Залускага. У 1768 г. І. Залускі быў сасланы Кацярынай ІІ у Калугу, а яго каштоўная бібліятэка засталася ў Варшаве пад апекай бібліятэкара Яноцкага, які з-за хваробы вачэй не вельмі турбаваўся аб захаванні кнігазбору. У выніку рэдкія выданні трапілі на рынак, дзе іх і набылі агенты І. Храптовіча. Акрамя таго, пасля канфіскацыі бібліятэкі Залускіх царскім урадам пры яе перавозе ў Пецярбург Храптовіч набыў частку кніг з гэтай бібліятэкі ў Гродне [16, с. 18].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння Галіцыі да Аўстрыі новыя ўлады ліквідавалі вялікую колькасць каталіцкіх манастыроў у Галіцыі, іх багатыя бібліятэкі таксама распрадаваліся. У тым жа кірунку дзейнічала і Кацярына ІІ. Гэтыя абставіны таксама скарыстаў І. Храптовіч для папаўнення свайго кніжнага збору [16, с. 18].

Павелічэнню бібліятэкі І. Храптовіча садзейнічала і развіццё выдавецкай справы ў Рэчы Паспалітай у XVIII ст.

Сярод шырокіх навуковых інтарэсаў І. Храптовіча была і цікавасць да пісьмовых крыніц. Любы зручны выпадак ён выкарыстоўваў для збору згаданай катэгорыі помнікаў – актаў, лістоў і іншых дакументаў. Не маючы магчымасці атрымаць арыгінал дакумента, ён здымаў копіі. Гэта дазволіла яму сабраць выдатную калекцыю арыгінальных і копійных дакументаў у колькасці 150 тамоў па гісторыі Рэчы Паспалітай і суседніх краін [16, с. 19].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да рарытэтаў шчорсаўскага архіва адносіліся: дзённік польскага пасольства ў Расіі 1686 г., дзённік Марыны Мнішак, апісанне каранацыі Уладзіслава V, геаграфічна-статыстычнае апісанне парафій Рэчы Паспалітай 1791 г., калекцыя геаграфічных карт і шмат іншага [12]. Дарэчы, значную колькасць геаграфічных карт падарыў Храптовічам польскі кароль Станіслаў Аўгуст, сам апантаны бібліяфіл. Дарыў кнігі ў Шчорсаўскую бібліятэку і гісторык Т. Чацкі.

Акрамя каштоўных бібліятэкі і архіва, І. Храптовіч сабраў багатую калекцыю жывапісу заходнееўрапейскіх мастакоў, гравюр мясцовага і замежнага вырабу (каля 7 тыс. адзінак). Сярод твораў галандскіх, фламандскіх, італьянскіх і аўстрыйскіх майстроў былі пейзажы С. Рэйсдаля і І. Кесэля, рэлігійныя сюжэты І. Лампі і І. М. Грасі. Меўся ў Шчорсах і «музей разнастайных помнікаў» [2, с. 53].

І. Храптовіч завяшчаў усю сваю ўласнасць, у тым ліку і бібліятэку, сваім сынам Адаму і Іераніму. Уладальнікам каштоўнага збору пасля бацькі спачатку быў Адам Храптовіч (1768–1844). Ён таксама меў выдатную адукацыю. З'яўляючыся ганаровым членам Віленскага ўніверсітэта, мецэнатам мастацтва і навукі, А. Храптовіч актыўна папаўняў бібліятэку старадрукамі і асабліва выданнямі XIX ст., у тым ліку віленскімі [10, с. 476]. На той момант бібліятэка складалася прыкладна з 7600 назваў (больш за 10 000 тамоў) [16, с. 20].

Паводле статута бібліятэкі яна была даступна для даследчыкаў і прыцягвала да сябе вядомых людзей, вучоных, грамадскіх дзеячаў. Яе фондамі карысталіся І. Лялевель, У. Сыракомля, К. Даніловіч, М. Маліноўскі і інш. Захаваліся датаваныя ліпенем 1902 г. правілы карыстання бібліятэкай Храптовічаў [13, с. 228].

Бібліятэкарамі ў Шчорсаўскай бібліятэцы працавалі цікавыя людзі: Ф. Баброўскі, сын мясцовага селяніна, байкапісец А. Глінскі, паэт М. Вольскі. Пасля вяртання з Сібіры, са ссылкі, з 1841 да 1846 г. бібліятэкарам у Шчорсах працаваў паэт і этнограф Ян Чачот, які актыўна дапамагаў А. Храптовічу камплектаваць бібліятэку.

З пераходам усіх каштоўнасцей ад Адама Храптовіча да яго брата Іераніма, а затым да яго сына Міхаіла – рускага дыпламата ў Неапалі, Бруселі, Лондане – яны не толькі не папаўняліся, але рэліквіі пачалі дарыць, раздаваць і прадаваць, а бібліятэка ўвогуле стала недаступна чытачам. Тым не менш збор па-ранейшаму быў вельмі значным. Пра веліч шчорсаўскага збору на той момант

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сведчыць тое, што яшчэ ў 1880 г. вядомы беларускі калекцыянер і даследчык А. Ельскіналічыў 20 тыс. тамоў літаратуры, хоць карыстаўся ён пры гэтым толькі каталогам бібліятэкі ў Шчорсах ад 1780 г. [6, с. 82].

Апошнім уладальнікам бібліятэкі Храптовічаў быў пляменнік М. Храптовіча М. А. Храптовіч-Буцянёў (сын яго сястры). Ён і яго брат, уладальнік маёнтка Шчорсы, у канцы XIX ст. упарадкавалі бібліятэку, а вядомы пецярбургскі вучоны С. Л. Пташыцкі выдаў каталог рукапісаў Шчорсаўскай бібліятэкі.

У пачатку XX ст. браты Храптовічы – Міхаіл і Канстанцін – вырашылі передаць кнігазбор на дэпазіт (часовае захаванне) у бібліятэку Кіеўскага ўніверсітэта св. Уладзіміра, дзе ён быў бы даступны шырокаму вучонаму свету. Перадача збору Храптовічаў была даручана прафесару М. Доўнар-Запольскаму. Прыём бібліятэкі праводзіў памочнік бібліятэкара бібліятэкі ўніверсітэта св. Уладзіміра М. Эрнст. Прыём быў завершаны 14–15 верасня 1913 г.

У Шчорсах засталося каля 3 тыс. кніг, а мастацкая калекцыя была вывезена ў Маскву. Лёс «музея помнікаў старажытнасцей» невядомы [2, с. 53].

Прыкладна ў той жа перыяд, а менавіта ў канцы XVIII ст., Аляксандр Сапега перанёс сваю рэзідэнцыю з Ружан у мястэчка Дзярэчын (цяпер – Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці), дзе ў 1786 г. быў узведзены новы палац і куды былі перанесены калекцыі, бібліятэка і архіў. У час падарожжаў па Еўропе Сапегі набывалі творы мастацтва (жывапіс, скульптуру, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), якія асядалі ў іх палацах. Акрамя таго, сапяжанская скарбніца змяшчала першакласную зброю і збрую, розныя ваенныя трафеі высокай мастацкай вартасці. Таксама ў склад збору ўваходзілі цудоўныя ўзоры дываноў, шатроў, макатак. Так, у Сапегаў захоўвалася серыя французскіх габеленаў, прысвечаных Аляксандру Македонскаму. Гонар збору надавалі 48 адзінак вельмі рэдкіх мазаічных карцін, 5 этрускіх ваз, шмат мармуровых і бронзавых скульптурных фігур, партрэтаў і барэльефаў, узоры мастацкай бронзы, шкла, мэблі і інш. [17, с. 304].

Наступны ўладальнік Дзярэчына – Францішак Сапега (1772–1830), вядомы патрыёт і адзін з найбольш адукаваных людзей свайго часу, пашырыў сапяжанскі збор. У дзярэчынскай галерэі можна было ўбачыць работы Ф. Франчыа (у прыватнасці, яго вядомую «Мадонну», якая сёння прадстаўлена ў экспазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу), П. дэла Векія (знакамітую кампазіцыю пад назвай «Чарадзей і чарадзейка»), П. Веранезе і іншых італьянскіх майстроў, некалькі французскіх – Дж. Кало, Бургіньёна і К. Ж. Вернэ, галандскіх мастакоў, такіх як Г. Метсю, С. і Я. Рэнсдаляў, Ван дэр Меера, Куіпа, Нетшэра, Пінакера і інш. Частка іх работ трапіла ў гэтую калекцыю ў якасці пасагу жонкі Францішка, П. Патоцкай, іншыя трапілі ў выніку Вялікай французскай рэвалюцыі, якая раскідала па свеце мастацкія скарбы французскай арыстакратыі [17, с. 304].

Мастацкі збор Сапегаў дапаўнялі бібліятэка і архіў. Архіўныя дакументы ахоплівалі перыяд з XV ст. па XVIII ст. і ўтрымлівалі прывілеі, напісаныя яшчэ да першага хрышчэння Літвы, лісты да Сапегаў рымскіх пап і манархаў розных краін [11, с. 149–150].

Многія прадстаўнікі згаданага роду ўдзельнічалі ў паўстанні 1830–1831 гг., за што ўся іх маёмасць (уключаючы і зборы) была канфіскавана. Музейныя зборы былі вывезены ў Маскву і Санкт-Пецярбург [2, с. 20]. Большая частка бібліятэкі і архіва была ў 1831 г. перададзена ў Імператарскую Публічную бібліятэку, частка – у Гродзенскую палату дзяржаўных маёмасцей, а адтуль у 1858 г. – у распараджэнне Віленскай архіўнай камісіі (у 1858 г.) [3, с. 39; 4].

Узнікненне «асветніцкіх» калекцый на мяжы XVIII і XIX стст. сведчыла аб пачатку новага этапу ў прыватным збіральніцтве на тэрыторыі Беларусі. Змяніліся задачы дзейнасці калекцыянераў, склад іх калекцый, былі зроблены першыя спробы ўвесці сабраныя прадметы ў навуковы ўжытак. Збіральніцтва наблізілася да асэнсавання прыналежнасці сваіх багаццяў усяму грамадству.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Расійскай імперыі, што адбілася на сацыяльна-эканамічным стане краю. Аднак у культурных адносінах жыццё мясцовага насельніцтва на працягу першай паловы XIX ст. не зведала кардынальных змен: па-ранейшаму адсутнічалі нацыянальныя школы, друк, навуковыя і культурныя ўстановы. Менавіта ў гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі, як і ў суседніх дзяржавах, з боку гісторыкаў, археолагаў, натуралістаў узнікла цікавасць да мясцовых старажытнасцей, а таксама мясцовай флоры і фаўны. Пашыраецца сацыяльны склад калекцыянераў, сярод іх з'яўляюцца прадстаўнікі трэцяга саслоўя, у вучоных-калекцыянераў фарміруюцца крыніцазнаўчыя адносіны да назапашаных матэрыялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шырокавядомы сучаснікам ваенна-гістарычны збор, створаны ў другой чвэрці XIX ст. у маёнтку Дабраўляны Віленскай губерні (цяпер – Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці). Ён належаў Адаму Гюнтэру фон Гейдэльсгейму (1782–1854), які быў жанаты на сястры К. Тызенгаўза Аляксандры Тызенгаўз. Дом Гюнтэраў быў адным з правінцыяльных культурных цэнтраў тагачаснай Беларусі, куды з вялікай ахвотай прыязджалі В. Дунін-Марцінкевіч, Т. Зан, С. Манюшка, У. Сыракомля, А. Кіркор і іншыя выдатныя дзеячы беларускай і польскай культуры. Яны пакідалі ў спецыяльнай кнізе свае водгукі, час ад часу дарылі дабраўлянскаму музею свае кнігі з аўтографамі, ноты, малюнкі і інш.

А. Гюнтэр быў апантаным калекцыянерам. Са сваіх падарожжаў ён прывозіў розныя цікавыя рэчы: статую, урны, творы мастацтва і інш. У яго бібліятэцы было шмат старадрукаў і рукапісаў. Збіраў ён таксама аўтографы вядомых асоб (адкрытасць дома гэтаму спрыяла), тэатральныя праграмы і іншыя «культурныя памяткі», якія складалі так званыя «Тэкі Гюнтэра», ці 16 альбомаў з надпісамі «Silva rerum» («Лёс рэчаў»). Асабліва ўладальнік ганарыўся рукапісам «Гражыны» з байкай «Сабака і воўк», што належаў А. Міцкевічу [15, с. 85]. Аднак асаблівую ўвагу ў сваёй калекцыянерскай дзейнасці А. Гюнтэр сканцэнтраваў на зброі і ваеннай амуніцыі, што дазволіла яму ў хуткім часе (пачынаючы з 1830-х гг.) сабраць выдатную калекцыю, якая складалася са шлемаў, кірасаў, латаў, парахаўніц, бердышаў, алебардаў, чаканаў, стрэлаў, баявых сякераў і лукаў, даспехаў крыжакоў і інш. У калекцыі А. Гюнтэра былі ўзоры ваеннай і паляўнічай зброі польскіх, рускіх, французскіх, турэцкіх, нямецкіх і мясцовых майстроў розных старажытных магнацкіх родаў, якія падкрэслівалі гераізм, рыцарскую годнасць шляхты краю[21, с. 240–241].

Да калекцыі зброі прымыкала нешматлікая калекцыя курганных знаходак. Акрамя таго, у А. Гюнтэра знаходзілася і невялікая калекцыя твораў выяўленчага мастацтва (творы мясцовых мастакоў Я. Рустэма, Ф. Смуглевіча, Я. Дамеля, Арлоўскага і інш.), шмат экспанавалася мініяцюр. Былі тут і творы Антычнасці [6, с. 82]. Дабраўлянскі музей не меў аналагаў, паколькі ў ім спалучалася інтэр’ернае і экстэр’ернае размяшчэнне прадметаў.

У 1824–1830 гг. па праекце Яна Барэцці ў Дабраўлянах быў узведзены новы палац у рамантычным стылі. Адначасова з будаўніцтвам палаца адбывалася рэканструкцыя старога парку ў пейзажным стылі. Яго асаблівасцю стала водная сістэма, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складалася з трох сажалак, каналаў, крыніц і гарманіравала з гротамі і альтанкамі. У адпаведнасці з патрабаваннямі часу заснавальнікі парку стварылі ідылічныя пейзажы вясковага жыцця. У парк былі звезены некаторыя характэрныя пабудовы бытавога прызначэння. Так, на ўскраіне знаходзілся малатарня ў выглядзе будана, дзе пераапранутая ў швейцарку жанчына гатавала ежу, а «нармандка» разлівала гарбату. Побач «ляжаў» пастух з дудой. Нечакана для гасцей у парку маглі з'явіцца цыганы ці літаратурныя героі накшталт Эсмеральды ці Квазімоды. Акрамя таго, на тэрыторыі парку размяшчалася мноства розных помнікаў, напрыклад, паганскія бажкі [2, с. 30; 6, с. 82]. У цэнтры парку знаходзілася распісаная прыгонным мастаком Гюнтэраў К. Бахмановічам капліца з алтаром, унутры якога за шклом былі раскладзены так званыя «свяшчэнныя рэліквіі» – ужо згаданая намі калекцыя зброі.

У самім доме, які сваім знешнім выглядам нагадваў музей, спецыяльна для яго былі заказаны вокны і дзверы, аздобленыя мясцовым дэкорам, такая ж мэбля.

Пэўная частка дабраўлянскага збору трапіла ў Беніцу Ашмянскага павета (цяпер – Маладзечанскі раён Мінскай вобласці), дзе была замужам адна з трох дачок А. Гюнтэра – Ідалія [6, с. 82]. З цягам часу Ідалія Гюнтэр перадала дабраўлянскі архіў сваім сваякам Пшэздзецкім, які да Другой сусветнай вайны перахоўваўся ў аднайменнай бібліятэцы ў Варшаве. Архіў часткова згарэў. Тое, што захавалася, пасля вайны трапіла ў Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве [15, с. 87].

Другая дачка – вядомая пісьменніца Г. Пузына (1815–1869) – перавезла таксама частку збору А. Гюнтэра ў Гарадзілава (цяпер – Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) таго ж Ашмянскага павета, куды яна выйшла замуж [6, с. 82]. Яна, як і бацька, збірала розныя гістарычныя прадметы. У яе альбомах (штамбуках) пакінулі свае аўтографы многія вядомыя асобы таго часу (Я. І. Сухадольскі, А. В. Арлоўскі, С. Манюшка, У. Сыракомля і інш.) [15, с. 85].

Пасля смерці А. Гюнтэра Дабраўляны перайшлі ва ўласнасць яго дачкі Мацільды (па мужу – Бучынскай), у якой, па звестках А. Плятэра, застаўся невялікі «збор розных археалагічных старажытнасцей» [7, с. 37; 21, с. 240].

Беларускі гісторык музейнай справы А. А. Гужалоўскі сцвярджае, што пасля смерці А. Гюнтэра ў 1854 г. збор быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзелены і вывезены ў Варшаву. У 1914–20-х гг. палац і цудоўны парк былі разрабаваны і знішчаны [2, с. 31].

Сярод калекцый першай паловы XIX ст. на тэрыторыі Гродзеншчыны можна прыгадаць археалагічную калекцыю, якой валодаў ваенны інжынер, вядомы гісторык, аўтар 9-томнай «Гісторыі літоўскага народа» Тэадор Нарбут (1784–1864). Пасля выхаду ў адстаўку з-за пагаршэння здароўя Т. Нарбут заняўся раскопкамі курганоў, вывучэннем этнаграфіі і фальклору Паўночнай Беларусі. У сваім маёнтку Шаўры (цяпер – Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці) знаходзіліся створаны ім «невялікі збор старажытнасцей», а таксама цікавая бібліятэка, у якой захоўваліся рэдкія рукапісы і выпіскі з кёнігсбергскага тайнага архіва, звязаныя з гісторыяй Беларусі [7, с. 34].

Дастаткова каштоўны, аднак не вельмі вялікі, мастацкі збор меў Войцэх Пуслоўскі (1762–1833), маршалак шляхты Слонімскага павета. В. Пуслоўскі вядомы ў гісторыі намаганнямі ў галіне развіцця прамысловасці краю. Свой збор карцін В. Пуслоўскі сфарміраваў пры дапамозе Ю. Серакоўскага, які знаходзіўся за мяжой на дыпламатычнай службе, дзякуючы якому ў Альберціне з’явілася шмат каштоўных карцін работы еўрапейскіх майстроў [2, с. 31]. Крыніцы сведчаць, што ў першай чвэрці XIX ст. альберцінскі палац упрыгожвалі эскізы Л. да Вінчы «Галоўка», П. П. Рубенса «Кентаўр», дзве работы Вернэ і Пітэра Брэйгеля, а таксама твор Давіда Тэнірса «У карчме» і інш. Таксама ў галерэі быў шэраг партрэтаў работы венецыянскіх мастакоў, што былі набыты В. Пуслоўскім падчас разборкі нейкага мясцовага палаца. Мясцовае мастацтва ў галерэі ў Альберціне было прадстаўлена работамі С. Чаховіча (дзве работы), Ю. Косака, Ф. Жмуркі і інш. [18, s. 186]. Сюды можна дадаць калекцыю сямейных партрэтаў, партрэты польскіх каралёў, гетманаў і іншых гістарычных асоб [8, с. 30].

Акрамя таго, у Альберціне меліся ўнікальныя калекцыі парцаляны, значнае месца ў якой займалі вырабы целяханскай мануфактуры (вазы і вазоны для кветак, кандэлябры, бутэлькі, сальніцы і інш.), тканін (шпалеры і дываны мясцовых мануфактур, слуцкія паясы, адзенне з каштоўных тканін мясцовай і замежнай вытворчасці і інш.) [18, s. 186–187].

Была ў Альберціне вялікая бібліятэка (больш за 10 000 кніг), якая размяшчалася ў асобнай зале з высокімі чырвонага дрэва шафамі, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пустыя месцы былі заняты спецыяльнымі стэлажамі, якія даходзілі да столі. У бібліятэцы меліся кнігі, якія датаваліся пачаткам XVII ст., шэраг энцыклапедычных выданняў XVIII ст., старыя атласы і карты даўніх польскіх зямель [18, s. 186]. Як і ў многіх маёнтках, у Пуслоўскіх, нягледзячы на пажар, захаваўся і каштоўны архіў, які ахопліваў перыяд, пачынаючы з XV ст., і тычыўся ўсіх родаў, што жылі на гэтых землях. Гэта былі каралеўскія прывілеі з подпісамі і пячаткамі манархаў, копіі з Літоўскай метрыкі, ліставанне «шэрагу пакаленняў», тэстаменты, паперы на нерухомасць. У бібліятэцы размяшчаўся і тэлескоп з усімі неабходнымі астранамічнымі прыборамі [18, s. 186].

Паводле сведчанняў польскага даследчыка Р. Мілеўскага, многае з Альберціна было вывезена ў Маскву ў пачатку Першай сусветнай вайны [8, с. 30].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Гродзеншчыны адзначалася пэўная колькасць гістарычных збораў рознага зместу, што было вынікам развіцця ўсяго комплексу гістарычных дысцыплін – археалогіі, нумізматыкі, археаграфіі і інш.

Адна са значных у археалагічных адносінах калекцыя належала вядомаму даследчыку беларускіх старажытнасцей Вандаліну Аляксандравічу Шукевічу (1852–1912). Па выніках сваіх археалагічных даследаванняў, якія ён праводзіў на тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай і іншых губерній, ім была сфарміравана калекцыя, якая знаходзілася ў маёнтку Нача Лідскага павета (цяпер – в. Нача Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці). У адпаведнасці з каталогам, які быў падрыхтаваны ўладальнікам калекцыі ў 1908–1909 гг., агульная колькасць прадметаў складала 5779 адзінак [2, с. 37]. Археалагічныя знаходкі былі размеркаваны па табліцах у трох аддзелах: каменны век, бронзавы век і век жалеза. Таксама ў В. А. Шукевіча была невялікая нумізматычная калекцыя. Грамадскасць мела магчымасць пазнаёміцца са зместам калекцыі археолага на спецыяльнай выставе, якая была прымеркавана да IX Археалагічнага з’езда ў Вільні ў 1893 г. Сам В. А. Шукевіч прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні з’езда і прадставіў на выставу тры табліцы з прадметамі з могільнікаў Лідскага павета [5, с. 19–20, 55–56]. Калекцыянер і даследчык дзяліўся вынікамі сваіх раскопак і дасылаў знойдзенае ў Імператарскую археалагічную камісію, сваім калегам-археолагам. Паводле звестак А. А. Гужалоўскага, калекцыя В. А. Шукевіча была падзелена паміж музеямі Расіі і Польшчы [2, с. 37].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавыя археалагічныя матэрыялы, якія былі выяўлены ў час раскопак на тэрыторыі Беларусі, увайшлі ў прыватную калекцыю Міхаіла Адольфавіча Федароўскага (1853–1923). Ён доўгі час жыў у Беларусі, дзе не толькі збіраў фальклор, але і праводзіў археалагічныя раскопкі (раскопваў курганы, шукаў палеалітычныя стаянкі) на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1884–1894 гг. М. А. Федароўскі пражываў ў Косіна Гродзенскай губерні (цяпер в. Косіна Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці). Там жа размяшчалася і яго археалагічная калекцыя, якую дапаўнялі шматлікія этнаграфічныя матэрыялы (адзенне, упрыгожанні, цацкі, прылады працы і іншыя побытавыя прадметы беларусаў) [2, с. 39]. М. А. Федароўскі быў сябрам многіх навуковых таварыстваў і таму на працягу 1877–1904 гг. ён перадаў большасць з сабранага музеям Варшавы.

З невялікіх калекцый гістарычнага кшталту можна згадаць калекцыю старадаўніх прадметаў, пераважна мясцовага паходжання, якая захоўвалася ў Новых Дзявяткавічах Слонімскага павета, дзе былі сабраны нумізматыка і калекцыя зброі. Таксама там меліся архіў з каштоўнымі дакументамі і бібліятэка, дзе захоўваліся надзвычай каштоўныя выданні (зельнікі, хронікі, працы энцыклапедыстаў і інш.) [18, s. 204–205].

Акрамя гістарычных калекцый, на тэрыторыі Гродзеншчыны ў другой палове XIX – пачатку XX ст. існаваў цэлы шэраг калекцый дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва. Як правіла, яны пачалі фарміравацца ў папярэдні перыяд, калі сядзібы магнатаў і заможнай шляхты напаўнялі рознымі прадметамі мастацтва. Першапачаткова яны набываліся для ўпрыгожвання палацаў, але пастулова набылі значэнне каштоўных мастацкіх калекцый. Былі выпадкі, калі падобныя калекцыі пераходзілі ад аднаго ўладальніка маёнтка да другога.

Так, значны збор прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сярод якіх вылучалася калекцыя парцаляны, знаходзіўся ў Обрынскім палацы, які належаў роду Кашыцаў [22, s. 80]. Падарожнік з Польшчы Т. Трыплін, пабываўшы ў 1856 г. у гродзенскім доме князёў Святаполк-Чацвярцінскіх, убачыў некалькі ўзораў старажытнай зброі (шаблі, ружжы, булавы), а таксама алейныя малюнкі. Ён лічыў, што гэта быў адзіны прыватны музей у горадзе [1, с. 127; 19, s. 27].

У палацы Адама Браніцкага ў Росі Ваўкавыскага павета меліся калекцыі антыкварных рэчаў, манускрыптаў і рэдкіх кніг, твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва. У Шчучыне Лідскага павета захоўваліся ўзоры мастацтва, старадаўняя мэбля, посуд, а таксама 50 тамоў сямейнага архіва Друцкіх-Любецкіх [6, с. 83].

Добрую калекцыю галандскага і французскага жывапісу сабраў у сваім маёнтку Клявіца Гродзенскай губерні (цяпер – Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці) бібліяфіл Альберт Умястоўскі. Акрамя таго, багаты кнігазбор з калекцыяй каштоўных і рэдкіх польскіх выданняў меўся яшчэ ў адным палацы Умястоўскіх у Жэмыславе той жа губерні (цяпер – Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці). Палац ў Жэмыславе быў багаты на замежную мэблю, творы выяўленчага мастацтва, прадметы з крышталю, кандэлябры, маёліку. Родны брат Альберта Уладзіслаў Умястоўскі ў маладосці сабраў ў Жэмыславе таксама каштоўную калекцыю літагравюр і польскіх манет [9].

Трэба адзначыць, што сярод калекцыянераў тагачаснай Беларусі назіраецца пэўная спецыялізацыя. Адна з лепшых калекцый польскага і беларускага жывапісу (больш за 200 адзінак) была створана ў Геранёнах Ашмянскага павета дзякуючы намаганням Ігнацыя Аскаравіча Корвін-Мілеўскага (1846–1926). Ён у перыяд з 1880 па 1895 г., не шкадуючы сіл і сродкаў, сабраў яе ў сваім маёнтку. У яго была самая вялікая ўласная галерэя сучасных мастакоў. Копій не было, а толькі арыгіналы. І. А. Корвін-Мілеўскі набываў работы, створаныя ў стылі мадэрн, імпрэсіяністаў, сімвалістаў. Купляў толькі тое, што яму падабалася, незалежна ад кошту. Напрыклад, у вядомага польскага мастака Я. Матэйкі набыў работу «Станчык».

Пад канец XIX ст. калекцыяніраванне было паказчыкам добрага густу, асабліва сярод буржуазна-фінансавай, прамысловай і гандлёвай грамадскасці. І. А. Корвін-Мілеўскі добра арыентаваўся ў мастацтве. Яго калекцыя была шырока вядомая, часта ўпаміналася ў друку як самая лепшая ў Польшчы. Тут былі работы Ю. Папкевіча, Л. дэ Левіа, Я. Station Станіслаўскага, Ю. Фалата, М. Ваўжыцкага, Я. Мальчэўскага. Мілеўскі купляў карціны толькі майстроў-сучаснікаў. Ён хацеў, каб гэтыя карціны распавядалі аб культуры Польшчы і засталіся на радзіме. Карціны ён пачаў збіраць каля 1890 г. і займаўся гэтым на працягу 14 гадоў. Сёння яны захоўваюцца ў лепшых музеях свету і высока ацэньваюцца. Пасля смерці Мілеўскага многія карціны купіў доктар Эміль Мэрвін. Сярод іх былі аўтапартрэты мастакоў, карціны бытавога жанру, рэлігійнай тэматыкі. Найбольш І. А. Корвін-Мілеўскага цікавілі гістарычныя карціны і пейзаж. У яго калекцыі было каля 250

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карцін. Асабліва вылучаліся работы А. Герымскага (24 шт.), В. Вадзіноўскага. В. Вадзіноўскі пісаў карціны толькі для Мілеўскага на тэму жыцця польскага народа і падкракаўскай вёскі, яе звычаяў, абрадаў. Мастаку часта пазіравала Цыцылія Уладзімірская, каханка Мілеўскага. У калекцыі былі аўтапартрэты Герымскага, Я. Матэйкі і інш. Карціны з калекцыі Мілеўскага атрымлівалі ўзнагароды на сусветных выставах [14].

Акрамя пералічаных гістарычных і мастацкіх збораў, на тэрыторыі Гродзеншчыны ў другой палове XIX – пачатку XX ст. было сфарміравана некалькі прыватных прыродазнаўчых збораў. Можна ўзгадаць некалькі энтамалагічных калекцый (калекцыі матылёў графа Г. А. Мячынскага, калекцыі майскіх жукоў расійскага чыноўніка барона фон Станге ў Гродне і У. дэ Вір'ен у в. Лішкі Гродзенскай губерні (цяпер – Бераставіцкі раён Гродзенскай вобласці). Дарэчы, барон фон Станге планаваў ахвяраваць сваю калекцыю ў будучым у музей. Павятовы жыхар, уладальнік м. Аўгустова, М. О'Брыен дэ Ласі збіраў калекцыю мясцовых птушак. Калекцыі Г. А. Мячынскага і М. О'Брыен дэ Ласі былі знішчаны падчас Першай сусветнай вайны, калекцыя У. дэ Вір'ена згарэла разам з палацам, дзе яна размяшчалася. Іншы лёс напаткаў калекцыю барона фон Станге, якая была рэквізавана польскімі ўладамі і змешчана ў музей у Белавежы, аднак, пазбаўленая належнага догляду, яна была страчана [20, s. 13].

Такім чынам, на тэрыторыі Гродзеншчыны ў перыяд з канца XVIII да пачатку XX ст. быў створаны шэраг прыватных калекцый рознай профільнай накіраванасці. Яны адыгрывалі значную ролю ў культурным і навуковым жыцці рэгіёна і ўсёй Беларусі. Зрухі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, рост нацыянальнай самасвядомасці садзейнічалі таму, што ў перадавой часткі грамадства ўзнікла жаданне вывучаць гісторыю, культуру і прыроду свайго краю. У асобных выпадках дзейнасць калекцыянераў характарызавалася не толькі старанным падборам прадметаў у сваіх калекцыях, высокім узроўнем іх навуковай апрацоўкі, імкненнем увесці сабранае ў навуковы ўжытак, але і разуменнем грамадскай ролі назапашанага.

1. *Грыцкевіч, В. П.* Шляхі вялі праз Беларусь: нарыс / В. П. Грыцкевіч, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 269, [2] с.

2. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2001. – 109, [2] с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Иваск, У. Г.* Частные библиотеки в России: ч. 2: приложение к журналу «Русский Библиофил» 1911 года / У. Г. Иваск. – СПб. : Альфарет, 2007. – [4], 80, [2], 39, [2] с.

4. *Иконников, В. С.* Опыт русской историографии: в 2 т. Т. 1, кн. 2 / В. С. Иконников. – Киев : Типография император. ун-та св. Владимира, 1892. – 1016 с.

5. *Каталог* предметов, доставленных на археологическую выставку при IX Археологическом съезде в Вильне в 1893 г. – Вильно: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. –112 с.

6. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118, [2] с.

7. *Киркор, А.* Значение и успехи археологии в наше время / А. Киркор // Записки Виленской археологической комиссии= Pamietniki kommissji Archelogicznej Wilenskiej / под ред. А. Киркора, М. Гусева. – Вильно : Тип. Ж.Завадского, 1856. – Ч.1. – С. 25–39.

8. *Мальдис, А.* Белорусские сокровища за рубежом / А. Мальдис. – Минск : Літаратура і мастацтва, 2009. – 205, [2] с.

9. *Нехвядовіч, К.* Жэмаласлаў / К. Нехвядовіч [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/ history/city_district/towns/n_zemoslaw/%D0%96%D1%8D%D0%BC%D0%B0%D0%BB%D0%B0%D1%81%D0%BB%D0%B0%D1%9E.html. – Дата доступу: 21.07.2012.

10. *Отрывок* из путевых записок профессора Виленского университета Игнатия Онацевича во время проезда его через одну часть Гродненской губернии в июле и августе 1822 г. // Северный архив. – 1822. – Ч. 4. – № 24. – С. 474–485.

11. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / [уклад., прадм., камент. А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча; уступ. і паслясл. М. Федароўскага. – Мінск : Полымя, 1997. – 268, [2] с.

12. *Пташицкий, С. Л.* Щорсовская библиотека графа Литавора Хрептовича : крат. сведения о собр. рукоп. / С. Л. Пташицкий. – М. : Печатня А. И. Снегиревой, 1899. – 31 с.

13. *Рошчына, Т.* Бібліятэка Храптовічаў / Т. Рошчына, А. Фурс // Памяць. Навагрудскі раён : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / навук.рэд.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1996. – С. 227–230.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Смаляшчэнка, А. І.* Хто такі Ігнацій Кароль Корвін–Мілеўскі / А. І. Смаляшчэнка // Геранёны [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://geraneny.narod.ru/people_2.htm – Дата доступу: 21.07.2012.

*15. Чагадаева, С. М.* Дабраўляны і іх жыхары / С. М. Чагадаева // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 84–87.

*16. Эрнст, М.* Библиотека гр. Хрептовича. К передаче ее университету св. Владимира / М. Эрнст // Русский библиофил. – 1914. – №6. – С. 16–21.

*17. Яніцкая, М.* Што напаткала сапяжанскі збор / М. Яніцкая // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрв. 1997 г. / рэдкал. : А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : ННАЦ імя Ф. Скарыны, 1997. – С. 303–306.

*18. Aftanazy, R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Cz. 1 : Wielkie Ksiestwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia / R. Aftanazy. T. 2: Wojewodztwa brzesko-litewskie, nowogrodzkie. – Wroclaw etc. : Ossolineum, 1992. – 473 s.

*19. Dziennik* podróży po Litwie i Zmudzi odbytej w 1856 roky przez d-ra T. Tripplina. – Wilno, 1858. – T. 1.

*20. Jakimowicz, J.* Miejskie muzeum przyrodnicze / J. Jakimowicz // Niemen. – 1935. – Yesz. 1. – S. 13–15.

*21. Kirkor, A.* Wycieczka archeologiczna po gubernii Wileńskiej / A. Kirkor; przez Jana ze Śliwina. – [S. l], 1855. – С. 237–257, [1].

*22. Zmigrodzki, J.* Nowogrodek i okolice / J. Zmigrodzki. – [Nowogrodek] : Nakl. Nowogrodzkiego Oddz. Pol. T-wa Krajoznawczego, 1931. – 118 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ